Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

*УДК 393 (=161.3) (476.2 – 2 Ветка)*

# Пахавальныя звычаі і абрады Веткаўшчыны

А. М. Палуян

У артыкуле разглядаюцца пахавальныя абрады і звычаі жыхароў Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці, аналізуюцца міфалагічныя ўяўленні, адлюстраваныя ў іх, вызначаецца маральна-этычная функцыя, роля традыцыйных вераванняў у эстэтычным выхаванні асобы.
**Ключавыя словы:** пахавальная абраднасць, язычніцкія і хрысціянскія элементы пахавання, вербальны код, міфалагізаваная народная свядомасць, анімістычныя вераванні і ўяўленні.

The article deals with the funereal customs and traditions of the Vetka district inhabitants of the Gomel region; it analyzes the mythological ideas reflected in them; it determines moral and ethical function and the role of traditional beliefs in the aesthetic education of a person.
**Keywords:** funereal customs, pagan and Christian elements of burial, verbal code, mythologized national consciousness, animistic beliefs and views, funeral ritual meal of the Slavs.

Нельга не пагадзіцца са сцверджаннем, што людзі сталі людзьмі толькі тады, калі пачалі хаваць сваіх памерлых сваякоў. Беларусы верылі, што смерць – гэта канчатковы вынік існавання чалавека на зямлі, і пасля яе ён пераходзіць у зусім іншы свет. Акрамя таго, існавала павер’е, што пахаваны ў зямлю нябожчык садзейнічае захаванню яе як родавага месца пражывання і адначасова спрыяе яе нараджальнай сіле [5, с. 74].

“Пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў, як слушна сцвярджае Т. І. Кухаронак, змяшчае ў сабе многія архаічныя рысы, звязаныя з народнымі ўяўленнямі пра замагільнае жыццё, пра душу, пра магчымасць зносін з нябожчыкам. Гэты шматгранны рытуал складаўся з разнастайных па функцыянальнай і семантычнай нагрузцы абрадавых дзеянняў пры строгай іх паслядоўнасці ў часе” [2, с. 354].

Пахавальна-памінальныя цырымоніі, на думку В. Я. Пятрухіна, мелі велізарнае сацыяльна-камунікатыўнае значэнне і павінны былі “ўключыць” выбыўшых з калектыву памёрлых у адзіны сацыяльны арганізм, адначасова продкі як бы “дапамагалі” ажыццяўляць “сувязь” жывых з замагільным светам [4, с. 20].

Актуальнасць нашага даследавання абумоўлена тым, што менавіта ў пахавальным абрадавым комплексе беларусаў Веткаўшчыны надзвычай шырока прадстаўлены народжаныя шматвяковым вопытам і паўсядзённым жыццём народа разнастайныя міфалагічныя ўяўленні, рацыянальныя веды пра чалавека, з’явы і аб’екты рэчаіснасці, а спецыфікацыя аксіялагічнай прыроды пахавальных звычаяў, прыкмет і павер’яў прадыктавана самім жыццём, у якім яны выступаюць своеасаблівым маральна-этычным кодэксам і з’яўляюцца невычэрпнай крыніцай практычнай народнай мудрасці.

Даследаванне пахавальнага комплексу жыхароў Веткі і Веткаўскага раёна ўлічвае шэраг тэарэтычных і практычных аспектаў. Сярод тэарэтычных аспектаў вылучаюцца наступныя: вызначэнне характару, часу, месца і механізмаў узнікнення шэрагу абрадавых дзеянняў, прыкмет, павер’яў, забарон. Да практычных аспектаў адносяцца ступень захаванасці традыцыйных пахавальных звычаяў і абрадаў Веткаўшчыны ў народнай памяці, працягласць у часе і трансфармацыя ў працэсе бытавання, абумоўленасць іх выкарыстання канкрэтнымі індывідуальнымі перажываннямі чалавека, калектыўным вопытам народнай мудрасці.

Смерць успрымалася як пераход ад адной формы існавання да другой, гэтак жа як і нараджэнне ці вяселле. Таму тут дзейнічалі “адшліфаваныя стагоддзямі абрадавыя коды, якія пэўным чынам будавалі абрадавую рэчаіснасць, прадпісваючы кожнаму члену сям’і, роду, вясковай абшчыне структуру абрадавых паводзін” [2, с. 354].

Нашы продкі верылі, што смерць забірае людзей не па свайму выбару, а тых, каго Бог ёй прызначыць: *Смерць не выбірае чалавека, а Бог выбірае, каму памерці* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Момант смерці ўспрымаўся як знаходжанне ў лімінальнай зоне, якую трэба было хутчэй пакінуць. Абрадавыя дзеянні для аблягчэння выхаду істоты з лімінальнай зоны былі шмат аналагічныя тым, што здзяйсняліся пры нараджэнні: *Каб лягчэй хвораму было памерці, то чыталі над ім Васкрэсную малітву* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.); *Када страшна паміраў, то адкрывалі вокны, штоб дух скарэй адляцеў* (в. Старое Сяло, Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.).

Перад пахаваннем нябожчыкаў абавязкова абмывалі і пераапраналі ва ўсё чыстае, “бо смерць і пахаванне разглядаліся як вяртанне ў матчына ўлонне” [1, с. 201]. Змена статусу індывіда адбывалася пры выкарыстанні рытуальнай функцыі вады: *Як памрэ чалавек, воду на акно ставілі, каб душа магла напіцца і памыцца.* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.).

Вада ў свядомасці беларусаў, у тым ліку і жыхароў Веткаўшчыны, – гэта ачышчальны сродак, без якога немагчымы пераход чалавека ў “той” свет. Абмываць і апранаць нябожчыка запрашалі сталых людзей. Разыходзіліся меркаванні веткаўчан аб тым, хто павінен мыць і адзяваць пакойніка – свае ці чужыя: *Былі і ёсць людзі, якія мыюць пакойніка, адзяваюць, прычытаюць* (в. Стаўбун, Чуяшова Г. Ф., 1930 г. н.); *Мыюць нябожчыка чужыя людзі* (в. Малыя Нямкі, Азаранка Г. І., 1932 г. н.); *Як памрэ чалавек, яго памыюць. Мые той, каго пазавуць. Самі радзіцелі, блізкія родственнікі мыць не далжны. Памыюць, потым у гроб паложаць* (в. Навасёлкі, Царыкава В. Г., 1934 г. н.); *Жонка, сын або дачка не мылі памерлага, не апраналі* (в. Брылёва Гомельскага р-на, Гарбузава М. Я., 1929 г. н., перасяленка з в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на); *Када чалавек памірае, яго нада абязацельна памыць. толькі не свой, а суседзі, ці каго папросюць. Яны (суседзі) яго памыюць, еслі мужчыну, то мужчыны, жэншчыну – жэншчыны, прыбяруць* (в. Старое Сяло. Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.); *Мыюць пакойніка абязацельна родственнікі, чужым нельга, адзяваюць тожа родстваннікі* (в. Старое Сяло, Малажэўская Т. А., 1934 г. н.); *Як пакойнік ляжыць у доме, яго мыюць і адзяваюць толькі свае* (в. Залаты Рог, Лук’яненка В. Ц., 1935 г. н.); *Калі паміраў хто, было вялікае гора яго сям’і. Пакойніка прыбіралі свае, родныя. Больш ніхто не должан быў мыць яго, адзяваць* (в. Залаты Рог, Чайкова К. Ц., 1930 г. н.).

Паколькі памерлы змяняў свой статус, пераходзіў з аднаго стану ў другі, то і апраналі яго ў спецыяльна падрыхтаванае адзенне: *У людзей была такая адзежда, якая ляжала на смерць, а на вялікія святы, там на Вялікдзень або на Ушэсце, яе пранашвалі* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.); *Памірае чалавек, яго адзявалі ў смярцёнае адзенне. Яно храніцца 10 год. Адзявалі па возрасту. Калі памёрла дзевушка да замужжа, яе ў свадзебнае плацца адзявалі* (в. Колбаўка, Кавалёва Е. П., 1930 г. н.).

Памытага і апранутага нябожчыка клалі на лаўку, галавой пад абразы: *Калі паміраў гаспадар, то ставілі труну каля акна, якое выходзіць на вуліцу, а калі гаспадыня, то каля акна, якое выходзіць на двор* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.).

Адразу пасля смерці люстэрка завешвалі белым палатном: *Када паміраў у доме чалавек, абязацельна завешывалі зеркала, патаму што нельзя. А то можа застацца душа ў зеркалі* (в. Старое Сяло, Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.); *Калі ўмірае чалавек, дык трэба завесіць все зеркала, штоб яны душу пакойніка не забралі* (в. Старое Сяло, Малажэўская Т. А., 1934 г. н.). Люстэрка ў народных уяўленнях – сімвал “падваення” рэчаіснасці, мяжа паміж светамі. Люстэрка ў месцы знаходжання прадстаўніка іншага свету (у нашым выпадку нябожчыка, яго душы) адкрывае да таго доступ, робіць яго бачным для людзей. Нябожчыка, які знаходзіўся ў пераходным стане, быў адкрыты да кантакту з іншасветам, неабходна было ізаляваць ад люстэрка. Невыпадковым з’яўляецца і выкарыстанне менавітага белага палатна – гэта найбольш пашыраны ў традыцыйнай беларускай культуры колер, які выступае як апазіцыя чырвонаму, што сімвалізуе жыццёвы пачатак, нараджэнне і статуснае перанараджэнне. У такім разе белы колер “можна трактаваць як сімвал смутку, жалобы, гора, смерці, трансфармацыі, пераходу ў іншы стан, іншы план існавання, сімвал дарогі з аднаго свету ў іншы” [1, с. 46].

На сям’ю разам са смерцю каго-небудзь з яе членаў звальвалася не толькі вялікае гора, псіхічныя і эмацыянальныя перажыванні, але і арганізацыйныя клопаты, матэрыяльныя выдаткі, таму яна з удзячнасцю прымала дапамогу. Напрыклад, з мэтай прадухілення чарговай смерці ў сям’і памерлага забаранялася рабіць дамавіну яго блізкім сваякам, таму труну рабілі і яму капалі толькі чужыя людзі: *Труну тож дзелалі чужыя, сваім няльзя. Потым ім (рабочым) плацілі за*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*эта. Просяць чужых усё рабіць, бо калі свае што робяць, то грэх* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г.н.); *Труну з хаты выносяць таксама чужыя людзі, сваім забаранялася* (в. Малыя Нямкі, Азаранка Г. І., 1932 г. н.); *Гроб свае не выносяць і яму не капаюць, а саседзі* (в. Брылёва Гомельскага р-на, Гарбузава М. Я., 1929 г. н., перасяленка з в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на); А *вось гроб ужо выносілі чужыя людзі*. (в. Залаты Рог, Чайкова К. Ц., 1930 г. н.).

Труна разглядалася як жыллё нябожчыка на “тым” свеце, таму яна павінна быць зручнай, каб пакойнік, зліўшыся з зямлёй, спрыяў адтуль жывым у іх штодзённых клопатах. Паўсюль на Веткаўшчыне існаваў звычай, які адлюстроўвае веру ў замагільнае жыццё: у дамавіну кладуць рэчы, якія спатрэбяцца для паўнавартаснага жыцця ў іншасвеце, а таксама дробныя грошы для аплаты месца на могілках: *Труну рабілі з любога дзерава. Усё дзеравяннае, а цвікі жалезныя* (жалеза – сімвал трываласці, непарушнасці, надзейнай ахаванасці). *У гроб ложаць грошы, штоб купіл месца. Гроб засцілаюць венікамі, лапкамі, а тады ўжо просцінамі. Набівалі падушку з сенам. З пер’ем не паложаць* (в. Колбаўка, Кавалёва Е. П., 1930 г. н.). *У гроб пакойніку рушнік завязвалі, штоб выціраўся. А кагда гроб апускаюць, дак дзеньгі кідаюць у магілку – там места выкупліюць, штоб пакойнік спакойна ляжаў* (в. Навасёлкі, Царыкава В. Г., 1934 г. н.); *Чалавека харанілі з яго вешчамі, якія ён, кады жыў, любіў* (в. Залаты Рог, Лук’яненка В. Ц., 1935 г. н.).

Згодна з беларускай традыцыяй, памёрлы павінен быў абавязкова адну ноч пераначаваць у роднай хаце. Калі парушыць гэты звычай, то нябожчык будзе ўвесь час прыходзіць да сваёй сям’і і сядзібы. Увесь гэты час пры ім прысутнічалі людзі, як бы сцераглі яго, ціха плакалі, маліліся, размаўлялі. Гэтай ноччу забаранялася галасіць: *Калі памірае, то ўсю ноч бабка чытае “Псалтыр”. У гэты дзень людзі ў хаце начуюць, вячэру робяць для ўсіх* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.); *Ложаць у труну. Тада ён (нябожчык) должан яшчэ ноч паляжаць дома, што б радныя з ім прасціліся. На ноч аставаліся толькі самыя блізкія. Звалі з царквы бабу, што чытае малітвы па ім усю ноч* (в. Навасёлкі, Царыкава В. Г., 1934 г. н.).

Смерць была экстрэмальнай сітуацыяй у жыцці сям’і, таму “псіхалагічныя стэрэатыпы абрадавых паводзін адыходзілі на другі план, саступаючы месца непасрэдным жывым эмоцыям, якія найбольш ярка праяўляліся ў межах вербальнага коду (галашэнні)” [2, с. 354].

Галашэнні па нябожчыку – непасрэдны абавязак яго родных і блізкіх, асабліва жонкі і дачок. Яны працягваліся звычайна да таго часу, пакуль памёрлы не быў пахаваны ў зямлю. Галашэннямі суправаджаліся і памінкі па нябожчыку [5, 309-310]: *Бабы, якія галосяць, называюцца галасунцы* (в. Стаўбун, Чуяшова Г. Ф., 1930 г. н.); *Тада ўжэ галасілі. Былі такія бабы, што зналі, што галасіць нада. І ў нас былі* (в. Старое Сяло, Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.); *На могілках галосіць той, каму жалка. Калісьці наймалі, хто ўмее прыгожа галасіць, грошы ім плацілі. Цяпер хто па сваіх прычытае, хто так плача* (в. Данілавічы, Дзмітрачкова Т. К., 1936 г. н., Чуяшкова Л. К., 1933 г. н.); *Вечарам ужо не плакалі, таму што будзе купацца ў слязах казалі. З галашэннямі выносяць гроб нябожчыка. Галосяць і калі вязуць яго да царквы, і на могілкі, калі праштаюцца з ім перад тым, як апусціць гроб у магілу* (в. Брылёва Гомельскага р-на, Гарбузава М. Я., 1929 г. н., перасяленка з в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на). Але ў час абмывання, апранання і пераносу цела на пасмяротную пасцель у хаце катэгарычна забаранялася галасіць: *Родныя памерлага не плачуць, бо ён будзе ляжаць у вадзе* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.); *Вечарам ужо не плакалі, таму што будзе купацца ў слязах казалі* (в. Брылёва Гомельскага р-на, Гарбузава М. Я., 1929 г.н., перасяленка з в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на). Царква наогул адмоўна ставілася да народных галашэнняў па нябожчыках. Бо, згодна з хрысціянскім вучэннем, чалавек пасля смерці трапляе ў вечнае загробнае жыццё, і трэба гэтаму радавацца, а не плакаць і гараваць.

Нябожчык павінен пераначаваць дома ноч, а потым яго хавалі: *Труну маглі выношваць і мужчыны, і жанчыны* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.). Адыходзіць з хаты разам з нябожчыкам і халодны прывід смерці, таму трэба несці нагамі ўперад: *Назаўтра яго выносілі. Труну неслі тыя, хто яё дзелаў. І нада абязацельна вынасіць нагамі ўперад. Патаму што ён мог сабе каго-небудзь прыглядзець і забраць з сабой на той свет* (в. Старое Сяло, Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

А яшчэ неабходна было абсыпаць труну, лаву, людзей, усю хату зернем. Верылі, што ў такім выпадку можна засцерагчыся ад хуткай наступнай смерці ды замовіць памерлага не выносіць з хаты дастатку, міру ды ладу. У пахавальным абрадзе на Веткаўшчыне выкарыстоўваецца найважнейшая збожжавая культура беларусаў, значна міфалагізаваная ў народнай свядомасці, – жыта, якое раўназначна багаццю і раю, а таксама такія сімвалы дабрабыту, шчасця, дастатку, вечнасці і пастаянства, як хлеб і соль: *Калі выносяць пакойніка з хаты, сыплюць жыта* (в. Стаўбун, Чуяшова Г. Ф., 1930 г. н.); *Выносілі нябожчыка нагамі ўперад, абсыпалі зернем. Везлі на кане, а ўперадзе неслі хлеб-соль* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.). Такім чынам, праз выкарыстанне жыта, хлеба і солі веткаўчане спадзяваліся захаваць няспынны рух жыцця, зачын, плоднасць, якую аберагае спагадны свет, дзе жывуць душы продкаў.

Дарогу на могілкі беларусы ў міфалагічным плане ўспрымалі як дарогу на "той свет", якая злучае прасторы жыцця жывых і памёрлых. "Вербальны код у гэтай частцы пахавальнага рытуалу шчыльна пераплятаўся з акцыянальным абрадавым кодам" [2, с. 359]: нельга абганяць працэсію, бо здарыцца вялікае няшчасце: *Як вязуць на кладбішча, дак нельзя, што б беременная шла (а то не родзіць), што б машына якая не перагарадзіла дарогу.* (в. Навасёлкі, Царыкава В. Г., 1934 г. н.); *Як заходзілі на кладбішча, то на суседнія магілы клалі што-небудзь, каб задобрыць душы продкаў* ( в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.).

На тэрыторыі Беларусі, і Веткаўшчыны ў тым ліку, існаваў звычай своеасаблівага апячатвання магілы: *Потым бацюшку прыводзілі. На кладбішчы бацюшка зямлю пячатае. Як спусцяць гроб у магілу, дак бацюшка бярэ сабе зямлю пячатам – там у цэркві моліцца. Еслі бацюшку не прывазілі, а зямлю ж усё роўна нада пячатаць, дак зямлю самі бралі, у цэркаў неслі* (в. Навасёлкі, Царыкава В. Г., 1934 г. н.). Рабілася гэта дзеля таго, каб нябожчык ужо ніколі не мог выйсці з магілы.

Адметнымі з'яўляліся пахаванні незамужніх дзяўчат: *Калі дзеўкі паміралі, да самага кладбішча неслі гроб на палаценцах; змяняліся хлопцы ды й неслі* (в. Данілавічы, Дзмітрачкова Т. К., 1936 г. н., Чуяшкова Л. К., 1933 г. н.); *Маладую дзяўчыну ложаць у падвянечным плацці* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.).

Мелі свае асаблівасці і пахаванні самагубцаў, бо самагубства лічылася ў народзе самым цяжкім грахом. Абрады, якія выкарыстоўваліся пры пахаванні самагубцаў, былі накіраваны на асуджэнне апошніх, на забыццё памяці пра іх:*: Еслі кто сам дзелаў самаўбійства, то яго не адпявалі, не паміналі, а харанілі дажа ні на кладбішчы, а за агароджай* (в. Старое Сяло, Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.).

Такім чынам, мы можам зрабіць вывад, што ў цяперашні час ў пахавальных абрадах на тэрыторыі Веткаўшчыны выразна выяўляюцца рысы культу продкаў, генетычна звязаныя з першабытнымі анімістычнымі вераваннямі і ўяўленнямі пра продкаў як ахоўнікаў роду, сям'і.

**Літаратура**

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мн.: Беларусь, 2004. – 592 с.

2. Беларусы. Т. 5. Сям'я / В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Т. І. Кухаронак і інш. – Мн.: Беларуская навука, 2001. – 375 с.

3. Карский, Е. Ф. Белорусы: научное издание: в 3 т. Т. 3, кн. 1: Очерки словесности белорусского племени. / Е. Ф. Карский. – Минск: БелЭн., 2007 – 584 с.

4. Петрухин, В. Я. Человек и животное в мифе и ритуале: Мир природы в символах мира культуры / В. Я. Петрухин // Мифы, культы, обряды народов зарубежной Азии: / Сб. ст./ – М., 1986. – 254 с.

5. Рыбаков, Б. А. Язычество Древней Руси / АН СССР, Отделение истории, Ин-т археологии. – М.: Наука, 1987. – 782 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 04.02.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ